Праект

**Палажэнне аб абранні адзінага кандыдата АДС**

**для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах**

**I.** ЦВК АДС фармуецца Прэзідыумам АДС з прадстаўнікоў усіх суб’ектаў АДС (да 30 жніўня 2009 г.) і з прадстаўнікоў зарэгістраваных прэтэндэнтаў на званне адзінага кандыдата АДС (па меры рэгістрацыі прэтэндэнтаў).

ЦВК АДС кіруе кампаніяй па абранні адзінага кандыдата АДС і вырашае спрэчныя моманты, якія ўзнікаюць падчас правядзення кампаніі.

**II.** 1) Рэгістрацыю прэтэндэнтаў на званне адзінага кандыдата АДС ажыццяўляе ЦВК АДС.

2) Зарэгістравацца прэтэндэнтам на званне адзінага кандыдата АДС мае права любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які:

а) Адпавядае патрабаванням існага заканадаўства да кандыдата ў Прэзідэнты Беларусі.

б) Валодае беларускай мовай.

в) Да рэгістрацыі ў ЦВК АДС размясціў артыкул на тэму: “Чаму А.Г.Лукашэнка не мае маральнага права быць Прэзідэнтам Беларусі?”

г) Напіша ў ЦВК АДС заяву з просьбай зарэгістраваць яго ў якасці прэтэндэнта на званне адзінага кандыдата АДС.

д) Падпіша абавязацельства прызнаць любы вынік кампаніі па абранні адзінага кандыдата АДС і ўсімі сіламі падтрымаць гэтага кандыдата.

ж) Унясе ў касу ЦВК АДС 20 млн. бел. руб.

3) Рэгістрацыя прэтэндэнтаў на званне адзінага кандыдата АДС адбываецца з 1 верасня 2009 г. па 1 сакавіка 2010 г.

**III.** 1) Агітацыя за прэтэндэнтаў пачынаецца з моманту рэгістрацыі прэтэндэнта ў ЦВК АДС і працягваецца да 15 сакавіка 2010 г.

2) Агітацыя адбываецца ў любых формах – выступы ў СМІ, сходы, мітынгі, пікеты, улёткі і г.д.

3) ЦВК АДС за сродкі, здадзеныя прэтэндэнтамі ў касу ЦВК АДС, выпускае спецыяльныя інфармацыйныя матэрыялы, на якіх размяшчаецца інфармацыя

і рэклама зарэгістраваных прэтэндэнтаў. (Выпуск матэрыялаў – снежань 2009 г.)

4) Публічная крытыка зарэгістраваных прэтэндэнтаў супраць адзін аднаго забараняецца.

**IV** 1) Галасаванне за прэтэндэнтаў у I туры адбываецца з 15 студзеня па 15 сакавіка 2010 г.

2) Галасаванне адбываецца ў офісах суб'ектаў АДС тых гарадоў, дзе ёсць магчымасць сфармаваць паўнавартасныя рэгіянальныя выбарчыя камісіі АДС (РВК АДС) з прадстаўнікоў большасці суб'етаў АДС і ўсіх прэтэндэнтаў, а таксама ёсць магчымасць свабоднага доступу грамадзянаў да ўдзелу ў галасаванні.

3) Адрасы і час працы РВК АДС павінны быць змешчаныя ў СМІ не пазней за 15 лістапада 2010 г.

4) Прымаць удзел у галасаванні мае права любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 18 год і прад'явіў РВК АДС пашпарт грамадзяніна Беларусі.

5) Выбаршчык мае права галасаваць толькі адзін раз. Выбаршчык мае права галасаваць толькі ў той РВК АДС, якая знаходзіцца найбольш блізка да месца ягонай прапіскі.

6) РВК АДС рэгіструе ўсіх выбаршчыкаў у спісе выбаршчыкаў, дзе заносяцца ўсе дадзеныя, неабходныя для падпісных лістоў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі.

7) РВК АДС выдаюць выбаршчыку бюлетэнь для галасавання (зацверджаны ЦВК АДС не пазней за 5 сакавіка 2010 г.), на якім стаяць прозвішчы прэтэндэнтаў, а на другім баку бюлетэня подпісы ўсіх сябраў РВК АДС.

8) Выбарчшык выкрэслівае прозвішчы ўсіх прэтэндэнтаў за выключэннем аднаго, таго, за каго ён галасуе.

9) Усе бюлетэні для галасавання захоўваюцца ў РВК АДС да заканчэння тэрміну галасавання, пасля чаго з выніковым пратаколам передаюцца ў ЦВК АДС (не пазней за 20 сакавіка 2010 г.)

**V** 1) Падлік вынікаў галасавання ў I туры РВК АДС ажыцьцяўляюць з 15 па 20 сакавіка 2010 г., і не пазней за 20 сакавіка передаюць бюлетэні і выніковыя пратаколы ў ЦВК АДС.

2) ЦВК АДС ажыццяўляюць падлік галасоў на аснове пратаколаў РВК АДС з 20 да 25 сакавіка 2010 г.

**VI** 1) Вынікі галасавання ў I туры абвяшчае ЦВК АДС у СМІ 26 сакавіка 2010 г.

**VII** 1) Адзіны кандыдат АДС абіраецца ўдзельнікамі Кангрэса АДС з двух прэтэндэнтаў, што набралі найбольшую колькасць галасоў у I туры (красавік 2010 г.)

2) Дэлегатамі Кангрэсу АДС могуць быць грамадзяне Беларусі, якія:

а) пры рэгістрацыі прад'явяць пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і пасведчаньне сябра суб'екта АДС ці сябра ініцыятыўнай групы любога з прэтэндэнтаў, што бралі ўдзел у I туры галасаваньня.

б) заплоцяць у касу Кангрэса АДС 200 тыс. бел. рублёў (гэтыя грошы пойдуць на арэнду памяшкання для Кангрэса, на пражыванне і харчаванне дэлегатаў Кангрэса, на старт агітацыйнай кампаніі адзінага кандыдата АДС).

в) Сябры суб'ектаў АДС і ініцыятыўных групаў прэтэндэнтаў могуць групамі збіраць неабходную складку і ад гэтай групы пасылаць дэлегата на Кангрэс.

г) Дэлегаты Кангрэсу тайным галасаваннем абіраюць адзінага кандыдата АДС.

д) ЦВК АДС абвяшчае вынікі тайнага галасавання на Кангрэсе АДС.

е) Усе прэтэндэнты і кіраўнікі суб'ектаў АДС выступаюць у падтрымку адзінага кандыдата.

ж) Адзіны кандыдат заклікае ўсіх прыхільнікаў незалежнасці і дэмакратыі далучацца да агульнай каманды. З гэтага выступу пачынаецца кампанія па абранні адзінага кандыдата АДС Прэзідэнтам Беларусі.